# *ЧАРГОВЫ КРОК ДА СЯБЕ*



**9 верасня 2026 года адбыўся чарговы семінарскі занятак у створанай пісьменніцкай арганізацыяй Прынёмання Грамадскай літаратурнай школе. Як і папярэдні, семінар быў прысвечаны падрыхтоўцы да запланаванай на бягучы год прэзентацыі нашага грамадска-адукацыйнага праекта.**

Мы зацікаўлены ў папулярызацыі, у рэкламе і ў папаўненні нашых шэрагаў, таму што ўдзел у нашым праекце нясе практычную карысць, добра ўплывае на развіццё нашага літаратурнага патэнцыялу. У наступным 2027 годзе наша літаратурная школа адзначыць сваё дзесяцігоддзе. Прэзентацый яе будзе некалькі. А што прэзентаваць, чым ганарыцца, – у нас ёсць. Увесь гэты час мы духоўна, інтэлектуальна, энергетычна падтрымліваем адзін аднаго і ўзаемна ўзбагачаем каштоўным вопытам, ведамі, уменнямі і навыкамі. У наяўнасці дыялог пакаленняў і светапоглядаў (станоўча адбіваецца адмова ад узроставых дыферэнцыяцый, уласцівых фармату школы маладога літаратара). Творчая дзейнасць нашых калег адзначаецца добрымі паказчыкамі або дасягненнямі. Напрыклад, празаік Ірына Аркадзьеўна Салата прынятая ў шэрагі Саюза пісьменнікаў Беларусі, актыўна заяўляе пра сябе не толькі на рэгіянальным, але і на рэспубліканскім узроўні, друкуецца, здымаецца на ТБ… Ёсць у нашым актыве і буйная ўзнагарода – Нацыянальная літаратурная прэмія ў галіне літаратурнай крытыкі і літаратуразнаўства (член СПБ, паэт, публіцыст Д. М. Радзівончык, ініцыятар праекта). Спіс дасягненняў нашага калектыву далёка не поўны. Больш аб'ёмна літшкола паспрабуе заявіць пра сябе на запланаванай прэзентацыі.




У ходзе семінарскага занятку мы абмеркавалі надзённыя праблемы. Пакуль невырашаным застаецца пытанне канчатковага складу выступоўцаў, а сярод іх – члены СПБ і Гродзенскага гарадскога літаб'яднання «Надзея», іншыя гродзенскія пісьменнікі. Нас сабралася вельмі мала, былі не гатовыя выступіць. Але мы ўсё ж такі правялі паўнавартасную рэпетыцыю публічнага мерапрыемства, абмяняліся думкамі наконт розных праблемных момантаў, намецілі некаторыя далейшыя крокі. Ясна адно: нас чакае шмат цікавага, і цяжкасці, якія не прымусілі сябе чакаць, нас не палохаюць. Скончыўся вераснёўскі семінарскі занятак Гродзенскай грамадскай літаратурнай школы на тэму «Прэзентацыя творчасці. Крок 2» сяброўскім чаяваннем.

*САЮЗ ПІСЬМЕННІКАЎ БЕЛАРУСІ*
*ГРОДЗЕНСКАЕ АБЛАСНОЕ АДДЗЯЛЕННЕ*

*На фота:* у створанай Гродзенскім абласным аддзяленнем СПБ Грамадскай літаратурнай школе адбыўся семінарскі занятак, яго тэма: «Прэзентацыя творчасці. Крок 2». Офіс ГрАА СПБ, 9 верасня 2026 года.


ПАДЗЯКА
ДИПЛОМ






ГРАМОТА
награждается
ДИПЛОМ
ПАДЗЯКА






**Выступае кіраўнік гарадскога літаб'яднання «Надзея», пісьменніца-педагог Юлія Чамярыс**




**У чэрвені гэтага года празаік Наталля Лабеева стала ўдзельніцай Рэспубліканскага форуму маладых літаратараў**



**Алена Шаламіцкая**




**Станіслаў Вішнеўскі**



**Ірына Полудзень**




Дзмітрый Радзівончык



Анатоль Апанасевіч


ПАДЗЯКА
ЗА СУПРАЦОЎНІЦТВА ПА ПАПУЛЯРЫЗАЦЫІ
КНІГ І ЧЫТАННЯ Ў 2023 ГОДЗЕ
ГРОДЗЕНСКАЕ АБЛАСНОЕ АДДЗЯЛЕННЕ
ГА «САЮЗ ПІСЬМЕННІКАЎ БЕЛАРУСІ»
ДИПЛОМ






**Кацярына Калік**




Ірына Салата




**Усе разам**
***Фота*** Анатоля Апанасевіча

\